1 Лейтес, Н. С. Возрастная одаренность школьников / Н. С. Лейтес // Прикладная психология и психоанализ. – 2002. – № 4 – С. 60–74.

**УДК 398.47(476.2)**

***А. Д. Дакукін***

## ВЕДЗЬМА Ў ФАЛЬКЛОРНАЙ ТРАДЫЦЫІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

*У дадзеным артыкуле на багатым фактычным матэрыяле, запісаным на тэрыторыі Гомельскай вобласці, прааналізаваны міфалагічныя звесткі пра ведзьму як адну з найбольш адметных істот народнай дэманалогіі і выяўлены тыповыя агульнаэтнічныя і рэгіянальна-лакальныя асаблівасці народных вераванняў, звязаных з гэтым персанажам.*

Дасціпны беларускі народ заўсёды імкнуўся бачыць свет незвычайна, небудзённа. Вынікам гэтага стала даволі распрацаваная сістэма ніжэйшай міфалогіі, адно з галоўных месцаў у якой займае такі персанаж, як ведзьма.

Багаты фальклорны матэрыял, архіўны і апублікаваны, паказвае, што тыповыя народныя ўяўленні пра тую ці іншую істоту спалучаюцца з мясцовымі адметнасцямі і ствараюць даволі цікавыя і разнастайныя вобразы. На ўсёй тэрыторыі Гомельшчыны пашыраны вераванні аб тым, што ведзьма – гэта старая (радзей маладая) жанчына, якая звязана з нячыстай сілай і прыносіць шкоду людзям: *«Гэта старая жанчына, якую калісьці выгналі людзі з сяла, таму што яна зрабіла каму-та дрэннае, заўсёды падманвала. Зараз яна калдуе, паддзелвуе людзям. Ведзьмай называюць чалавека, які можа рабіць штосьці незвычайнае»*(запісана ў в. Чырвоная Буда Добрушскага раёна) [1, с. 114]; *«Ведзьма – ето жанчына з чорнымі вачамі, дліннымі, касматымі валоссямі, з кастлявымі рукамі, у плацці з мешкавіны»*(запісана ў в. Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна) [2, с. 61]; *«Вядзьмарка – гэта заўсёды страшная і непрыемная баба, на якую і глядзець не хочацца. Але яна можа прыкідвацца прыгажуняй»*(запісана ў в. Куты Веткаўскага раёна) [2, с. 65]. Існуюць таксама варыянты назваў гэтай істоты: *«Калдуна і ведзьму называюць усяк: чараўнікамі і чараўніцамі, знахарамі і знахаркамі, варажбітамі, ведзьмакамі і ведзьмамі, ваўкалакамі. Часцей жа ведзьму называюць калдуньяй, чарадзейкай, а калдуна – ведзьмаком, чараўніком»*(запісана у г. Добруш) [1, с. 125]. Аднак, заўважым, што часцей за ўсё паняцці «ведзьма»і «знахарка»размяжоўваліся, бо адны былі злымі, а другія – добрымі: *«Некаторых людзей незаслужана абвіняюць у варожбе, ведаўстве. Напрымер, збірае чалавек травы, знае, як імі лячыцца, а яго лічаць ведзьмаком. А ён жа толькі знаўца траў! А шкоду ведзьмы ўсё ж прыносяць»*(запісана ў г. Гомель) [2, с. 70]. Займацца вядзьмарствам маглі не толькі жанчыны, але і мужчыны, прычым яны маглі рабіць шкоду выключна мужчынам або маглі быць звязанымі з «нячыстымі»прафесіямі: *«Вядзьмак – гэта мужчына, каторы занімаўся калдаўством. Ён паддзелваў толькі мужчынам»*(запісана ў в. Неглюбка Веткаўскага раёна) [2, с. 66]; *«Калдунамі былі мужчыны, а ведзьмамі – жанчыны»*(запісана ў г. Добруш) [2, с. 125]; *«Ето почти тоже, што и ведьма, но ето мужчына, и он больш злой»*(запісана ў г.п. Лельчыцы) [2, с. 89]; *«Казалі, што ведзьмакамі становяцца часцей цесляры, пастухі, кавалі, млынары і пчаляры. Гэтыя людзі маглі шкодзіць другім людзям, псавалі ім гаспадарку»*(запісана ў г. Гомель) [1, с. 128].

Людзі маглі станавіцца ведзьмакамі і вядзьмаркамі рознымі шляхамі: праз стасункі з чортам і нячыстай сілай, праз атрыманне ведаў ад іншай ведзьмы, а маглі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўвогуле быць імі ад нараджэння: «*Ведзьмай станавілася жанчына, калі ў яе ўсяляўся злы дух. Таксама ведзьмай магла стаць дзяўчына, народжаная па-за шлюбам у трэцім пакаленні. Некаторыя дзяўчыны пры нараджэнні атрымлівалі веды ў спадчыну ад маці-ведзьмы. Некаторыя жанчыны атрымлівалі веды ад паміраючай ведзьмы*»(запісана ў в. Раманаўка Мазырскага раёна) [2, с. 90]; «*Ведзьмы падзяляюцца на наследственных, якім навука ідзе па наследдзю, і вучоных, якія вучацца ад іншых ведзьмаў*»(запісана ў п. Бальшавік Гомельскага раёна) [1, с. 129]; «*Калдуння – гэта ведзьма. Яны палюбоўніцы і памошніцы чорта. Аднак ведзьмы жывуць на зямлі, а чорт пад зямлёю*»(запісана ў в. Матнявічы Чачэрскага раёна) [1, с. 123]; «*Нельзя паказваць дзіця ва ўзросце да года ў люстэрка, будзе вядзьмак*»(запісана ў в. Акцябр Буда-Кашалёўскага раёна) [2, с. 291].

Маючы адносіны да нячысцікаў, ведзьма займаецца чорнымі справамі і ўсяляк імкнецца «паддзелуваць»людзям. Адной з самых пашыраных функцый яе з'яўляецца адбіранне малака ў кароў, бо даіць уласную карову ведзьма не хоча ці проста яе не мае: «*Ведзьмы могуць адбіраць малако ў кароў. З гэтай мэтай ведзьма ходзіць і збірае расу цадзілкай, і расу гэтую дае сваёй карове, або проста вешае цадзілку і з яе цячэ малако. Ведзьма можа даіць карову і на адлегласці. Яна абводзіць на зямлі круг з загаварам і ўтыкае ў сярэдзіну нож, малако задуманай каровы пацячэ само*»(запісана ў п. Бальшавік Гомельскага раёна) [1, с. 129]. Праз свой дрэнны характар і злоснасць вядзьмарка робіць шкоду людзям, сурочыць, насылае спрэчкі і звадкі. Для гэтага яна падкідвае на падворак ці ў хату іголкі, загавораныя расліны, робіць «залом»у жыце: «*Ведзьмы насылалі на чалавека і на хатнюю жывёлу сурокі. Яны псавалі скаціну, адбіралі ў кароў малако, у свіней – сала, у кур – яйцаноснасць*»(запісана ў в. Раманаўка Мазырскага раёна) [2, с. 90]; «*Яшчэ ведзьмы плоха дзелалі жыту. Прыходзілі на поле, скручвалі яго. А калі прыходзілі гаспадары і зжыналі яго, то гэта было дрэнна. Будзе балець гаспадар*»(запісана ў в. Сінск Лоеўскага раёна) [2, с. 90]; «*Завіткі робяць, каб навесці порчу на жывёлу, на людзей. Хто на што заўе. У нас было, што конь здох*»(запісана ў в. Скепня Жлобінскага раёна) [3, с. 131]. «Калдунння»валадарыла і сіламі прыроды: «*Ведзьма магла наслаць непагоду, буру, навальніцу, засуху*»(запісана ў в. Раманаўка Мазырскага раёна) [2, с. 90].

Дасягнуць патрэбных мэт і вынікаў ведзьме дапамагаюць разнастайныя віды чарадзейства. Найбольш папулярнымі ў жыхароў Гомельшчыны з'яўляюцца былічкі пра пераўтварэнне вядзьмарак у нейкіх жывёл і прадметы гаспадаркі. Напрыклад, жанчына магла станавіцца жабай: «*Адзін чалавек ідзе, бачыць – жаба на дарозе, ён яе пабіў. Назаўтра баба стогне, што плечы баляць. То ведзьма была*»(запісана ў в. Скепня Жлобінскага раёна) [1, с. 131]; свіннёй – «*Ведзьмы дзелаліся свіннямі. Адзін раз узялі ды адсеклі такой свінне, якая забегла ў хлеў, нагу, а гэта аказался калдун, які жыў у той дзярэўні*»(запісана ў в. Азершчына Рэчыцкага раёна) [1, с. 136]; кошкай – «*Адна баба ў нашай вёсцы дзелалася кошкай і забірала ў кароў малако*»(запісана ў в. Капань Рэчыцкага раёна) [1, с. 118]; «*Ведзьмы могуць з'яўляцца ў выглядзе жывёлы ці птушкі: свіння, конь, карова, мыш, варона, сарока, вуж, гадзюка, і ў выглядзе прадметаў: палка, куст, калясо, рэшата, ком*»(запісана ў г. Добруш) [1, с. 125]. Ведзьма магла таксама лётаць у паветры: «*Лётала на мятле праз дымаход, можа быць, кім захоча*»(запісана ў г. Добруш) [1, с. 130].

На працягу года ведзьмы некалькі разоў збіраюцца ўсе разам, асабліва актывізуючыся на Купалле: «*Ведзьмы збіраюцца ў гурт. У іх іе главар, ён ім камандуе, каму врадзіць: людзям, худобе, усяму наваколлю. У нашай вёсцы была такая жанчына. Умесце работалі, радам жылі, а калі прыходзіць Іван Купала, то яна скідаецца сабакам і бегае па дварах*»(запісана ў в. Хутар Светлагорскага раёна) [1, с. 100]; «*Акрамя Купалля, ведзьмы актывізуюць сваю дзейнасць і ў такія святы, як Троіца,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Благавешчанне, Вялікдзень, Вадохрышча, Каляды, Юр’е»*(запісана ў п. Бальшавік Гомельскага раёна) [1, с. 129].

Нядзіўна, што ва ўсе часы людзі імкнуліся супрацьстаяць шкоднаму вядзьмарскаму ўплыву і выкарыстоўвалі самыя разнастайныя сродкі: шэпты, малітвы, замоўленыя рэчы (іголкі, пясок); раскладвалі на падворках і ў хляве крапіву, запальвалі грамнічную свечку, малявалі крэйдай крыжыкі на сценах, пырскалі свянцонай вадой на жывёлу і абсыпалі хату пасвечаным макам. У гэтых дзеяннях можна ўбачыць як хрысціянскія, так і паганскія матывы, якія суіснуюць тут у непарыўнай еднасці, бо чалавек імкнуўся ўсімі магчымымі сродкамі захаваць бяспеку і шчасце сваёй сям’і. Вось як раней засцерагаліся ад сурокаў: «*На Вадохрышча, каб засцерагчы хату і гаспадарку ад нячыстай сілы, гаспадар гэтай хаты ставіў мелам крыжыкі над варотамі, дзьвярыма, вокнамі, над уваходам у хлеў. На Вялікдзень скарынкі ад пасхі ніколі не выкідвалі, а сушылі, таўклі і клалі ў гарэлку – гэта засцерагала ад ведзьмаў. Яшчэ трэба было вешаць ля ўвахода ў хлеў стрэчанскія свечкі, бо іх баіцца нячыстая сіла. Каб засцерагчыся ад уздзеяння ведзьмаў, трэба перад хлявамі класці барану, ставіць у хлеў асінавае дрэўца, абсыпаць карову пасвечаным макам*»(запісана ў п. Бальшавік Гомельскага раёна) [1, с. 129–130]; «*Супраць ведзьмаў на Купала тыркалі крапіву каля варот і самасеяным макам абсявалі двары, пырскалі вакол двара пасвяцонай вадой*»(запісана ў в. Скепня Жлобінскага раёна) [1, с. 131]; «*Карова зусім не давала малака. І, аказалася, што гэта шкодзіць ведзьма. Тады яны пазвалі свяшчэнніка, які прачытаў малітвы ў хляве. І потым усё стала на свае месцы*»(запісана ў в. Гаць Акцябрскага раёна) [2, с. 59]; «*Карова мая чорная! Ад паганых вачэй і [няшлюбных] дзяцей вочкамі асвяціся, вушкамі атматніся, ножкамі адтапчысь, хвосцікам адмахнісь. Будзь ты не ўрочна, не прыгаворна. Хто маю карову ўракне – таму кроўю вочы завалакне. Чужым вачам – соль да пячаль. Што думаеш мне – палучы сабе*»(замова ад ведзьмы) [3, с. 61]. Цікава, што сустракаюцца звесткі, паводле якіх абараніцца ад ведзьмы вельмі цяжка: «*Ад ведзьмы засцерагчыся, дзеткі мае, не так-то легко. Эта тыя будуць знаць і то не ўсягда. А такжа яна, як вам сказаць, духам сядзіць… Ведаеце, дзеці мае, ад ведзьмаў малітвы не было, таму і не маліліся. От еслі найдзеш чалавека, тожа што знае сільнее яе, то ён яе пераборае, а еслі не найдзеш, то шукай*»(запісана ў г. Хойнікі) [1, с. 119–120].

Своеасаблівай з’яўляецца і смерць ведзьмаў, бо яны паміраюць з цяжкасцямі, на працягу некалькіх дзён. Каб памерці лягчэй, ведзьма павінна перадаць камусьці свае веды. Калі ж такой асобы няма, трэба зрабіць адтуліну ў страсе – і вядзьмарка сканае: «*Вось яны, дажы када ўміралі, дык яны маглі і 3 дні ўміраць, і нідзелю маглі. І будуць выць і мучацца, пака памруць. Патом, када ўмрэ, дык можа яшчэ ні даць другому жыць у сваёй кварцірцы ці ў сваім доме. Будзе хадзіць там і стукаць, і што папала будзе дзелаць, пака ні пойдуць і не праб’юць яму грудзі асінавым калом*»(запісана ў г. Гомель) [2, с. 72]; «*За сваю сувязь з нячыстай сілай ведзьма караецца цяжкай смерцю. Яна не можа памерці, пакуль не перадасць свае веды. Разбіралі столь у хаце, каб аблегчыць ёй мукі*»(запісана ў в. Раманаўка Мазырскага раёна) [2, с. 91].

Такім чынам, можна стварыць партрэт тыповай ведзьмы: гэта непрыгожая (у большасці выпадкаў), старая жанчына, якая звычайна жыве адна на краі вёскі, кантактуе з нячыстай сілай, сурочыць і «паддзелвае»людзям і жывёле, асабліва любіць адбіраць малако ў кароў. Можа пераўвасабляцца ва ўсялякіх звяроў (у большасці былічак гаворыцца пра свінню) ці прадметы (напрыклад, кола). Лягчэй за ўсё пабачыць вядзьмарку на Купалле. Паміраюць ведзьмы доўга, нават у такім выпадку трэба было выцягваць дошкі са столі. Займацца чарадзействам маглі і мужчыны, якіх называлі ведзьмакамі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Засцярогай ад вядзьмарства былі малітвы, замовы, рэчы, асвечаныя ў царкве, крапіва, раскладзеныя ў хляве вострыя прадметы і інш. Ад вышэйназваных адрозніваліся знахары, шаптухі, варажбіткі, якія не злоснічалі, а лячылі людзей.

Людзі сцвярджаюць, што раней ведзьмаў было больш, а тыя, што сустракаюцца цяпер, не ўсе «настаяшчыя». Можна меркаваць, гэта было так па той прычыне, што свет быў тады не такім зразумелым і вядомым, і народ у сваіх уяўленнях імкнуўся запоўніць гэтую невядомасць рознымі здарэннямі і незвычайнымі выпадкамі, напрыклад: кола, якое размаўляе, струмені малака, што цякуць са сцен і інш. Нягледзячы на пэўны недавер, з якім сённяшняе грамадства ўспрымае гісторыі аб персанажах ніжэйшай міфалогіі, мы не можам адмаўляць той факт, што гэта важная частка народнай культуры беларусаў, дакрануўшыся да якой, можна глыбей спасцігнуць іх светапогляд.

### Літаратура


1 Народная міфалогія Гомельшчыны / уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ «Нёман», 2003. – 320 с.

2 Беларуская міфалогія. Хрэстаматыя: вучэб. дапаможнік / уклад. В. С. Новак. – Мінск: РІВШ, 2013. – 394 с.

3 Замовы / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г. А. Барташэвіч; гал. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Беларуская навука, 2000. – 597 с.



**УДК 37.091.3:811’243:004-057.874**



***Ю. А. Дворак***


## КОМПЬЮТЕРНОЕ СОПРОВОЖДЕНИЕ ОБУЧЕНИЯ МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ ИНОСТРАННОМУ ЯЗЫКУ


*Статья посвящена анализу компьютерного сопровождения обучения иностранному языку учащихся I ступени образования, который основывается на принципах, методах и приемах, обеспечивающих его реализацию в практике обучения иностранному языку младших школьников.*


На этапе начального общего образования необходимость в привлечении информационных и коммуникационных технологий для повышения эффективности обучения иностранному языку обусловлена как социально-экономическими, так и предметно-содержательными факторами. Современный вектор общественно-экономического и политического развития государства и социума требует обеспечить готовность подрастающего поколения к жизни в информационном обществе, сформировать способность личности отвечать нуждам такого общества, реагировать на вызовы инновационной экономики. В связи с этим уже в начальной школе ставится вопрос о формировании у обучающихся элементарной иноязычной коммуникативной компетенции, которая призвана обеспечить социализацию младшего школьника, его аккультурацию, адаптацию в сложном и многоязычном информационном пространстве.

Следует отметить, что проблема обеспечения компьютерной поддержки процесса иноязычной подготовки младших школьников относится к числу наименее изученных, в связи с чем данное исследование является своевременным и актуальным.

Целью исследования является теоретическое обоснование системы использования компьютерных средств, необходимых для сопровождения процесса обучения


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ